# АПОВЕСЦЬ ЯКУБА КОЛАСА «НА ПРАСТОРАХ ЖЫЦЦЯ» ЯК УЗОР СТАНАЎЛЕННЯ ЖАНРУ ШКОЛЬНАЙ АПОВЕСЦІ

**І. В. Нікіценка**

*Саіскальнік кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, nikite@bsu.by;*
*Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук, дацэнт Л. В. Алейнік*

У артыкуле разглядаецца роля аповесці Якуба Коласа «На прасторах жыцця» ў развіцці жанра школьнай аповесці, тлумачыцца паходжанне жанру школьнай аповесці, апісваюцца важныя элементы і рысы, па якіх можна адносіць творы да жанру школьнай аповесці.

***Ключавыя словы***: школьная аповесць; жанр; адукацыя; беларуская літаратура; герой.

# ПОВЕСТЬ ЯКУБА КОЛАСА «НА ПРОСТОРАХ ЖИЗНИ» КАК ОБРАЗЕЦ СТАНОВЛЕНИЯ ЖАНРА ШКОЛЬНОЙ ПОВЕСТИ

**И. В. Никитенко**

*Соискатель кафедры теоретического и белорусского литературоведения,*
*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*nikite@bsu.by;*
*Научный руководитель – кандидат филологических наук, доцент Л. В. Олейник*

В статье рассматривается роль повести Якуба Коласа «На просторах жизни» в развитии жанра школьной повести, объясняется возникновение жанра школьной повести, описываются важные элементы и признаки, по которым произведения можно отнести к жанру школьной повести.

***Ключевые слова***: школьная повесть; жанр; образование; белорусская литература; герой.

# YAKUB KOLAS'S STORY «ON THE SPACES OF LIFE» AS AN EXAMPLE OF THE FORMATION OF THE SCHOOL STORY GENRE

**I. V. Nikitenko**

*Researcher of the Department of Theatrical and Belarusian Literature Studies,*
*Belarusian State University,*
*4 Independence Ave., 220030, Minsk, Belarus,*
*nikite@bsu.by;*
*Supervisor – PhD, Ass. Professor L. V. Oleynik*

The article examines the role of Yakub Kolas's story «On the Open Spaces of Life» in the development of the genre of the school story, explains the emergence of the genre of the school story, describes the important elements and features by which works can be classified as the genre of the school story.

***Keywords***: school story; genre; education; Belarusian literature; hero.

Аповесць Якуба Коласа «На прасторах жыцця» (1926) займае асаблівае месца ў беларускай літаратуры як адзін з першых узораў станаўлення жанру школьнай аповесці. Гэты твор не толькі адлюстроўвае сацыяльна-гістарычны кантэкст паслярэвалюцыйнай Беларусі, але і вызначае асноўныя рысы жанру, якія пазней развіваліся ў творчасці іншых аўтараў.

Школьная аповесць, з'яўляючыся жанрам эпічнага апавядання, мае мноства тыпаў герояў, якія падзелены на тры групы [4, с. 7]: вучні; педагагічны калектыў (настаўнікі, дырэктар, завучы і г. д.); бацькі. У канфліктах школьнага свету аповесці ўдзельнічаюць дарослыя і дзеці, якія знаходзяцца ў сацыяльным статусе «настаўнік», «бацька», «навучэнец». Вытокам жанру школьнай аповесці з'яўляецца заходняя літаратура Англіі і Германіі сярэдзіны XIX стагоддзя, у якой жанравыя прыкметы школьнай аповесці пачалі афармляцца ўжо ў сярэдзіне XIX стагоддзя [3, с. 279].

Героямі твораў школьнай аповесці з'яўляюцца самыя звычайныя дзеці і падлеткі. Змены ў герояў адбываюцца пасля пераадолення сур'ёзных выпрабаванняў, якія дапамагаюць сфармаваць цвёрды характар, адказнасць, высокія маральныя якасці: сяброўства, сумленнасць, справядлівасць, спагадлівасць, адданасць. Школа выступае не толькі як навучальная ўстанова, але і як месца, дзе фармуюцца сяброўскія і рамантычныя сувязі.

Тэма школы ў літаратуры напрамую звязана з развіццём школьнай адукацыі і педагагічнай думкі, а таксама з праблемамі выхавання.

Аповесць Якуба Коласа належыць да беларускай класічнай літаратуры, якая «сцвярджае ідэі патрыятызму, свабоды, грамадзянскага абавязку, тыя духоўныя каштоўнасці, без якіх немагчыма паўнавартаснае жыццё грамадства і чалавецтва ў цэлым» [1, с. 329]. Твор узнік на хвалі сацыяльных перамен 1920-х гадоў, калі адукацыя становіцца інструментам сацыяльнай мабільнасці. Аўтар, былы настаўнік, уключае ў аповесць элементы ўласнага досведу: удзел у настаўніцкіх з’ездах, праца ў вясковых школах. Галоўныя героі – Сцёпка Барута і Аленка Гарнашка – увасабляюць мару аўтара пра пераадоленне сацыяльных бар’ераў праз веды.

Героі аповесці сутыкаюцца з праблемамі, якія з’яўляюцца тыповымі для моладзі тых часоў на розных узроўнях набыцця адукацыі: канфлікт паміж працай і вучобай (дапамога па гаспадарцы і імкненне да навукі); гендэрныя стэрэатыпы: Сцёпка першапачаткова ставіцца да Аленкі з пагардай («баба»), але праз сумесную вучобу пераасэнсоўвае яе як роўную; пэўныя сацыяльныя абмежаванні падчас паступлення («прымаць будуць у першую чаргу дзяцей рабочых»). На прыкладзе Сцёпкі бачна, што адукацыя патрабуе ад галоўнага героя не толькі розуму, але і мужнасці ісці супраць сістэмы, сям’і, нават самога сябе.

Момант сталення, які перажывае герой, – гэта яго асэнсаванне свету праз паступовае набыццё новага досведу, пераацэнку каштоўнасцей і трансфармацыю светапогляду. Гэты працэс уяўляе сабой эвалюцыю ад дзіцячай наіўнасці да сталага разумення жыцця. У школьнай аповесці гэты этап мае сістэмаўтваральнае значэнне: менавіта праз вучнёўскую рэчаіснасць герой упершыню сутыкаецца з сапраўднымі выклікамі, што фарміруе яго як асобу.

Аленка, нягледзячы на «жаночы лёс», дасягае поспехаў у навуцы, што робіць яе сімвалам новай савецкай рэальнасці.

Аповесць вылучаецца дэталёвай распрацоўкай унутранага свету герояў. Сцёпка праходзіць шлях ад дзіцячай зайздрасці да павагі да Аленкі, што сімвалізуе змену традыцыйнага светапогляду. Аленка, у сваю чаргу, прадстаўлена як персанаж з актыўнай пазіцыяй: яна не толькі вучыцца, але і выступае супраць сацыяльных абмежаванняў. Гэта робіць яе прадвеснікам вобразу «новай жанчыны» ў беларускай літаратуры.

У аповесці Якуба Коласа «На прасторах жыцця» Сцёпка, як тыповы прадстаўнік вясковай моладзі, імкнецца да адукацыі, каб змяніць свой сацыяльны статус. Яго шлях на рабфак звязаны з пераадоленнем розных бар’ераў. Сцёпка ідзе супраць волі бацькі, што выклікае напружанасць у сям’і. Гэта адлюстроўвае канфлікт пакаленняў: стары парадак, дзе праца

на зямлі была галоўнай каштоўнасцю, жорстка сутыкаецца з імкненнем моладзі да самавызначэння.

Тэма адукацыі як змагання часта сустракаецца і ў іншых літаратурах, асабліва ў творах, дзе героі з беднага саслоўя імкнуцца да самарэалізацыі. Можна ўзгадаць «Марцін Ідэн» Джэка Лондана (галоўны герой твора Марцін становіцца пісьменнікам дзякуючы самаадукацыі), «Джэйн Эйр» Шарлоты Брантэ (галоўная гераіня Джэйн, сірата, праз адукацыю імкнецца да незалежнасці). Сцёпкава змаганне за месца на рабфаке – гэта не толькі гісторыя пра асобу, але і прыклад перамогі розуму і характару над абставінамі. Ён не апусціў рукі, калі яму не хапіла месца на факультэце, а дамогся ад вышэйстаячай арганізацыі залічэння звыш камплекта. Барацьба да канца – і перамога-паступленне.

Школьны настаўнік у творы выступае надзвычай важнай, цэнтральнай фігурай, якая ўвасабляе ідэі асветы як сілы сацыяльнага пераўтварэння. Ён не толькі выконвае ролю педагога, але і становіцца сімвалам надзеі для моладзі, якая імкнецца да ведаў; надае «вектар жыцця» для Сцёпкі («Абнадзеіў настаўнік Сцёпку, ахвоты да навукі паддаў. І пайшоў Сцёпка дадому другім чалавекам»). Настаўнік падтрымлівае Сцёпку, бачачы ў ім патэнцыял: «Не пакідай навукі: у цябе вялікія здольнасці». Гэтыя словы не толькі заклікаюць да навучання, але і адлюстроўваюць яго веру ў сацыяльны ліфт праз веды. Настаўнік дапамагае Сцёпку атрымліваць падручнікі, якіх не хапае ў вёсцы, што дазваляе хлопцу рыхтавацца да экзаменаў і паглыбляць веды. І нават пасля заканчэння школы настаўнік працягвае кансультаваць Сцёпку, дапамагаючы яму самастойна займацца. Таксама настаўнік падтрымлівае праект Сцёпкі па асушванні балота. Гэта падкрэслівае яго ролю не толькі як педагога, але і сябра, старэйшага таварыша.

Настаўнік сімвалізуе моц адукацыйнага прагрэсу, якая дае магчымасць вясковай моладзі «выйсці на шырокія прасторы жыцця».

Пэўная роля адведзена ў творы і топасу школы. У школе адбываюцца рэпетыцыі і сумеснае баўленне часу Аленкі Гарнашкі з іншай моладдзю (Маня Гулька, Марынка Пракапчук, Люба Андручэня, Мікіта Дудзік, Макарка Лагун). Таксама паказаны калектыў «вышэйшай» школы – студэнты-рабфакаўцы Сымон Галыза, Міхайла Драбак, Ніна Ральніцкая.

Аповесць Якуба Коласа вылучаецца рэалістычным стылем, які дазваляе аўтару стварыць жывыя і пераканаўчыя вобразы. Я. Колас выкарыстоўвае дэталёвыя апісанні, дыялогі, каб паказаць унутраны свет герояў. Аповесць таксама мякка выкарыстоўвае элементы сацыяльнай крытыкі, паказваючы недахопы і супярэчнасці паслярэвалюцыйнага грамадства. Гэта робіць твор не толькі літаратурным, але і адукацыйным,

бо чытачы могуць аналізаваць сацыяльныя праблемы праз прызму літаратуры.

Школьная аповесць як жанр у беларускай літаратуры характарызуецца арыентацыяй на маладую аўдыторыю, закранае праблемы станаўлення асобы і часта выкарыстоўваецца ў адукацыйных мэтах.

Аповесць «На прасторах жыцця» стаіць ля вытокаў жанру школьнай аповесці і закладае асновы для развіцця школьнай тэмы ў беларускай літаратуры.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Бельскі А. І.* Вывучэнне творчасці пісьменнікаў: класікі і сучаснікі ў школе. Мінск: Аверсэў, 2005. – 352 с.

2. *Колас Я.* Збор твораў: у 14 т. Т.8. Мінск, 1975.

3. *Литовская М. А.* Школьная повесть как инструмент анализа повседневности советской школы // Антропология советской школы: Культурные универсалии и провинциальные практики: сб. ст. / сост. С. Г. Леонтьева, К. А. Маслинский, М. В. Ромашова. Пермь, 2010. С. 278–291

4. *Черняк М. А.* Школа как диагноз: опыт современной прозы // Детская литература сегодня: сб. науч. ст. Екатеринбург: УрГПУ, 2010. С. 7–18.